


ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "BACKAUSCYNA" ("FATHERLAND")
Authorized by EUCOM Hqs Civil Affairs Division, 1. January 1951, Nr. UNDP 225
Responsible Publisher: Wladimir BORTNIK
Printing Office: Buchdruckerei der Apostolischen Visitatur, München 8, Rosenheimer Straße 46a. — Telefon-Nr. 45 81 43
Post Adress: "Backauscyna", München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
Die Administration der Weißruthenischen Zeitung „BACKAUSCYNA"
München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE"

№ 6 (85) Нядзеля, 10 лютага 1952 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 6

Вайна чужымі рукамі

Аснаўным і галоўным імкненьнем Савецкага Саюзу ёсьць панаваньне над сьветам і стварэньне сусьветнага СССР пад гэгэмоніяй Масквы. Доказаў такой, а ня іншай палітыкі чырвонага Крамля ёсьць ужо дастаткова, хаця многія заходнія палітыкі й дзяржаўныя мужы не разумеюць, ці, хаваючы, як страўс, галаву ў пясок, разумець ня хочаць. Масква пасьлядоўна імкнецца ўсякімі спосабамі аслабіць Захад, каб на руінах ягонае дэмакратычнае сыстэмы й заходняй цывілізацыі ўстанавіць «дыктатуру пралетарыяту», г. зн. дыктатуру Крамля. Аб гэтым сьветчыць уся навука тэарэтыкаў расейскага бальшавізму — Леніна й Сталіна, а таксама й уся палітыка Савецкага Саюзу, будучая пасьлядоўным ажыцьцяўляньнем гэтае навукі.

Многія выдатныя палітыкі Захаду аднак уважаюць, што, ня гледзячы на гэта, Саветы ў хуткім часе самі вайны не пачнуць. Не пачнуць таму, што, ня гледзячы на зусім праўдападобныя часовыя ўдачы ў першай фазе вайны, якія былі-б дасягнутыя дзякуючы гэапалітычнаму палажэньню СССР і трыманьню ў баявой гатовасьці вялізарнай арміі, у вапошняй фазе яны ваўну гэтую прайгралі-б. Ня гледзячы на ўсе перавагі, Саветы ня могуць і думаць аб дараўнаньні Захаду, калі ходзіць пра ягоныя эканамічныя й тэхнічныя магчымасьці, якія ў канцовай фазе вайны былі-б вырашальнымі.

Дзеля гэтага Савецкі Саюз ужо ад даўжэйшага часу прымяніў іншую стратэгію й тактыку: аслабляць Захад і весьці зь ім вайну на розных адрэзках сусьветнага фронту, але чужымі рукамі, коштам крыві іншых народаў, астаючыся самым з боку ў ролі «нэўтральнага» абсэрватара. Зразумела, што такое імкненьне Саветаў ня ёсьць яшчэ іхнай канчальнай мэтай, але толькі найпэўнейшым сродкам, што вядзе да ейнага дасягненьня. Ім ходзіць пра тое, каб шляхам бязупынных войнаў на аддаленых ад ЗША кантынэнтах зьвязаць там галоўныя сілы Захаду, шляхам нутраной дывэрсыі пятых калёнаў аслабіць ягоную абароназдольнасьць, а пры помачы аднаго й другога прывесьці заходні сьвет да эканамічнае руіны й псыхалягічнага заламаньня. Самі-ж бальшавікі, непасрэдна не ангажуючыся ў вайну, будуць за гэты час прысьпешаным тэмпам павялічваць сваю ваенную магутнасьць, каб у вадпаведны мамэнт, калі аслабленьне й вычэрпаньне Захаду станецца ўжо дакананым фактам, сказаць сваё апошняе слова сілаю зброі й гэткмі спосабам ажыцьцявіць свой плян сусьветнага панаваньня.

Згодна гэтага свайго пляну, Масква сыстэматычна вядзе й фінансуе сваю падрыўную акцыю ў цэлым сьвеце, разбудоўваючы свае пятыя калёны й прапагандовую афэнзыву, як, прыкладам, апошняя сусьветная кампанія за мір. Ейная дывэрсыя й разбудоўваньне пятых калёнаў маюць на мэце аслабляць абароназдольнасьць Захаду, а ў выпадку вайны — выклікаць дамашнія грамадзянскія войны, што адыгралі-б ролю другога фронту.

Трэба адцеміць, што на паўночна- й паўдзённа-амэрыканскім кантынэнце дывэрсыйная й прапагандовая акцыя камуністых ня мела значнага пасьпеху. Ня мае яна пасьпеху й у Заходняй Эўропе, за выключэньнем Францыі й Італіі, якія зьяўляюцца моцна падмінаванымі камуністычнымі ўплывамі. Гэтак у новым францускім парляменце другой найсільнейшай партыяй, пасьля дэгалістых, зьяўляюцца камуністыя. Падобная, а мо' й яшчэ горшая сытуацыя й у Італіі. Што камуністыя ня думаюць абмяжвацца палітычнай і прапагандовай дзейнасьцю на Захадзе, сьветчаць наступныя факты: толькі за апошніх шэсьць год у тайных камуністычных сховішчах Італіі было знойдзена паліцыяй 169 гарматаў, 695 мартыраў, 5026 кулямётаў, 160.000 вінтовак і мільёны пачкоў набояў. Гэтыя факты маюць сваю грозную вымову.

ЦЕРАЗ АЗЫЮ ДА АПАНАВАНЬНЯ СЬВЕТУ — ЦЕРАЗ КІТАЙ ДА ЗДАБЫЦЬЦЯ АЗЫІ

Яшчэ Ленін сказаў, што, каб апанаваць сьвет, трэба мець у сваіх руках Азыю. І ягоны наступнік Сталін астаўся верным гэтаму запавету Леніна. Ён таксама ўважае вялізарны азыяцкі кантынэнт зь ягонымі нявычарпальнымі людзкімі рэсурасамі за пляцдарм да апанаваньня ўсяго сьвету, а Кітай — за такі-ж пляцдарм да апанаваньня ўсяе Азыі. Кітай ужо Крэмль мае, бо наіўныя спадзяваньні тых заходніх палітыкаў, якія ўважалі, што Мао-Тсэ-Тунг станецца кітайскім Тытам, не апраўдаліся.

Пры помачы Кітаю зь ягоным 460 мільённым насельніцтвам Масква мае цяпер разьвязаныя рукі на ўсім азыяцкім кантынэнце, не патрабуючы самой непасрэдна ангажавацца ў ніякую вайну ў гэтай часьці сьвету. Надзеі на перамір'е ў Карэі, перагаворы аб якім цягнуцца ўжо сем месяцаў і, здаецца, скончаацца тым, чым пачаліся, далі магчымасьць камуністым сканцэнтраваць і папоўніць свае сілы. Ня трэба забывацца, што калі-б у Кітаю не перамаглі камуністыя, дык карэйская вайна не пачалася-б. Калі-б-жа й пачалася, то ўжо даўно была-б скончаная перамогаю паўдзённых карэйцаў пры невялікай дапамозе Амэрыкі, бо Крэмль ня змог-бы тады пасылаць на фронт нявычарпальныя масы кітайскіх «ахвотнікаў».

Вайсковы карэспандэнт «Нью Ёрк Таймс» Болдвін піша, што за сем месяцаў ад пачатку перагавораў аб пераміp'і палітычная й вайсковая пазыцыя ЗША ў Карэі пагоршылася. У выніку паслабленьня вайсковага ціску збройных сілаў ЗН і надсыланьня мноства савецкіх матарыялаў, кітайцы й паўночныя карэйцы мелі магчымасьць сканцэнтраваць вайсковую наземную й паветраную сілу, а таксама зрабілі вялікія запасы. «Калі мы адновім бай ў большым абсягу, то вораг напэўна здабудзе з гэтага псыхалягічны капітал — піша Больдвін. — Апрача гэтага, мы натрапім на добра прыгатаванага праціўніка. Дык няма таму пэўнасьці, што новая афэнзыва войскаў ЗН будзе пасьпяховай навет у тым выпадку, калі на Карэю будуць прысланыя дадатковыя вайсковыя адзінкі». З другога боку, — уважае амэрыканскі карэспандэнт — калі сытуацыя будзе разьвівацца так, як цяпер, то грамадзкая думка ЗША, якая значна зьмянілася ўжо ў мінулым годзе, напасьледак будзе дамагацца пакінуць Карэю.

Такі дасюлешні білянс карэйскай вайны, у якой Захад, галоўна, бо на цэлых 90%, Амэрыка, нясе вялізарныя страты, якія прынамсі ў дзесяць разоў перавышаюць страты Савецкага Саюзу.

Як можна судзіць із словаў Чэрчыля ў ягонай справаздачы з паездкі ў Вашынгтон, Вялікабрытанія згадзілася памагчы Амэрыцы ў расшырэньні вайны на цэлы Кітай, калі перагаворы аб пераміp'і не дадуць ніякага выніку. Гэта абазначае, што ў гэткім выпадку Амэрыка й Вялікабрытанія пойдуць па лініі сярэдніцтва ЗША, падзеі пакуль што разьвіваюцца ў вадваротным кірунку.

Гэтак іранскі ўрад Масадэка пядаўна зарваў пакт прыязьні зь Вялікабрытаніяй, заключаны ў 1857 годзе, а таксама зажадаў закрыць на тэрыторыі Ірану ўсе брытанскія канзуляты, што й было Вялікабрытаніяй выканана 21 студзеня сёлета.

Палажэньне ў Эгіпце можна назваць станам неабвешчанай вайны, якая асабліва 25 і 26 студзеня дасягнула свайго кульмінацыйнага пункту. Паймена, у пятніцу 25 студзеня на вуліцах гораду Ізмаіля разгарэўся фармальны бой паміж аддзеламі эгіпскай паліцыі й ангельскім гарнізонам, у выніку якога было 45 забітых і 150 цяжка раненых па абодвых баках. У сувязі з падзеямі ў

(Заканчэньне на 2 балоне)

У вабліччы новай палітычнай сытуацыі

Паняволеныя бальшавізмам народы ў сваей вызвольнай дзенайсьці на бацькаўшчыне, як і іхныя суродзічы на эміграцыі йдуць супольным фронтам, здаючы сябе справу з таго, што толькі ўзгодненая акцыя можа прывесьці да мэты — вызваленьня ад бальшавізму й аднаўленьня сваіх вольных і незалежных дзяржаваў. Адзначаючы гэтую супольнасьць палітычнага дзеяньня, як факт вялікае вагі, нельга аднак не заціміць і некаторых, навет паважных дысанансаўцу у многанацыянальнай сям'і паняволеных народаў, выкліканых або адменнымі палітычнымі каньюнктурамі, у якіх некаторыя народы знаходзяцца. або хвальшывым разуменьнем сваей будучай палітычнай сытуацыі хных вядучых палітыкаў, або адным і другім адначасна. Апошнія падзеі як міжнароднага, гэтак і нутранага значэньня родзяць у сувязі з гэтым неадкладную патрэбу некаторай рэарганізацыі ў міжнацыянальных дачыненьнях паняволеных народаў.

У сувязі з далейшым завастрэньнем міжнароднага напружаньня й што раз большым перакананьнем дэмакратычнага Захаду, што трэйцяй сусьветнай вайны ўнікнуць ня ўдасца, сяньня-ж Захад паважна ўжо прыступіў да мабілізаваньня ўсіх сваіх сілаў і апрацоўваньня найважнейшых стратэгічных ходу, што будуць выкарыстаныя ў будучай вайне. Адным і з мамэнтаў, і то не апошняе вагі, у ваенных прыгатаваньнях Захаду зьяўляюцца пляны выкарыстаньня ў гэтай вайне рэвалюцыйных сілаў паняволеных народаў. Адсюль — узмоцненае зацікаўленьне нацыянальнымі й палітычнымі праблемамі гэтых народаў, за чым мусяць прыйсьці, — і напэўна хутка прыйдуць — розныя пляны й праекты вырашэньня іхнага будучага лёсу.

Паколькі эўрапэйскі Захад у сваей афіцыяльнай палітыцы баіцца, — праўдападобна з тактычных мяркаваньняў: каб не дражніць бальшавікоў — паставіць праблемы будучага лёсу паняволеных народаў на парадку дня, даючы да зразуменьня, што для яго Эўропа канчаецца на лініі Бугу й Сану, пастолькі ў ЗША паяўляюцца што раз часьцейшыя й што раз больш stationоўчыя выказваньні за зрэвідаваньне дасюлешняга становішча Амэрыкі ў дачыненьні да паняовелных бальшавізмам народаў. Таму ня выключана, што прагрэсыўная Амэрыка, якая сьмела й наважана адкідае ўсякія традыцыйныя шаблёны навет і ў палітыцы, калі пераконваецца аб іхнай нерэальнасьці й шкоднасьці, у недалёкай будучыні займе ў дачыненьні да паняволеных народаў такую пазыцыю, якая будзе згодная з нашымі нацыянальнымі інтарэсамі й палітычнымі імкненьнямі.

Гэтая эвэнтуальнасьць выклікала ажыўленную дыскусыю й спрэчкі на нацыянальныя тэмы сярод усіх паняволеных народаў з аднаго боку, як і ў радох усіх палітычных плыняў расейскае эміграцыі — з другога. Гэтая апошняя пачала на балонах сваей прэсы біць трывогу, стараючыся пераканаць адказныя палітычныя й дзяржаўныя дзейнікі Захаду аб шкоднасьці разьдзелу Расеі й аб вялікіх дабрадзействах, якія прынясе ня толькі паняволеным народам, але й самому-ж Захаду далейшае захаваньне турмы народаў.

Усё гэта нацыянальную праблему падсавецкага ўсходу пачынае рабіць актуальнай. Хоць яшчэ афіцыяльная палітыка Захаду не сказала ў гэтай справе свайго слова, тым ня менш аднак да нас сяньня прыглядаюцца, нас вывучаюць, здаючы сабе справу з таго, што гэтага пытаньня абмінуць ня ўдасца.

Сяньняшняя палітычная сытуацыя папаняволеных народаў, хаця цяжкая й скамплікаваная, аднак абнадзейваючая. Яна ад нас вымагае асаблівага завастрэньня нашае ўвагі на ўсе падзеі, што нас непасрэдна датычаць, нашае палітычнае актыўнасьці й такту. Яна таксама родзіць неабходную патрэбу грунтоўнае перабудовы міжнацыянальных узаемдачыненьняў, бо тыя формы й палітычныя канцэпцыі, што гэтыя дачыненьні фармавалі, зьяўляюцца ўжо сяньня ў вабліччы новае сытуацыі й новых патрэбаў — недастатковымі.

Дасюлешнія канцэпцыі

Да апошняга часу існавалі сярод палітычных эміграцыяў дзьве фармацыі міжнацыянальнага супрацоўніцтва й дзьве канцэпцыі разьвязаньня ў будучыні нацыянальнае праблемы паняволеных народаў —**канцэпцыя Антыбальшавіцкага Блёку Народаў (АБН) і канцэпцыя Інтэрмарыюм або Міжмор'я,** калі ня браць пад увагу некаторых іншых спробаў, робленых у гэтым кірунку, якія аднак былі кароткатрывалымі.

Аб Інтэрмарыюм доўга гаварыць ня прыходзіцца. Яно плянуе фэдэрацыю шаснаццаці эўрапэйскіх народаў, што засяляюць тэрыторыю між Балтыйскім, Чорным і Адрыятычным морам, пад гэтэмоніяй Польшчы, якая дамагаецца ў ей вядучай ролі. Таму гэтая канцэпцыя ня здабыла асаблівай прыхільнасьці сярод астальных пятнаццаці народаў, якія, калі-б і згадзіліся на такую фэдэрацыю, то толькі на прынцыпах абсалютнай роўнасьці. Ды й самі палсякі, ня хочучы ніяк пагадзіцца із стратаю Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны, ня выказалі асаблівай актыўнасьці й шырэйшага зацікаўленьня ў разьвіцьці сваей міжморскай канцэпцыі. Дзейнасьць Інтэрмарыюм, калі ня браць пад увагу некалькі высланых мэмарыялаў у міжнародныя органы, фактычна ня выйшла із сфэры тэарэтычных разважаньняў.

Зусім інакш запрэзэнтаваўся АБН. Гэтая арганізацыя, што задзіночвае палітычныя прадстаўніцтвы й арганізацыі аж 24 народаў, выказала вялікую палітычную й прапагандовую актыўнасьць спачатку ў Нямеччыне, а апошнім часам ува ўсіх краінах вольнага сьвету, дзе толькі знаходзяцца эмігранты з Усходу. Аднак АБН, задзіночваючы ў сваіх радох нацыянальныя прадстаўніцтвы народаў, што знаходзяцца ў неаднолькавай палітычнай сытуацыі, ці лепш сказаць, сяньняшняй каньюнктуры, у сучасны мамэнт ня зможа справіцца з тымі новымі праблемамі, да якіх частка ягоных сяброў ставіцца абыякава, а якія для астальных — зьяўляюцца сяньня справай найважнейшай.

З гледзішча на гэтую розную палітычную каньюнктуру, выкліканую не аднолькавым мінулым, усіх сяброў АБН можна падзяліць на тры групы: да першай залічым усе тыя народы, што пасьля першай сусьветнай вайны вельмі коратка цешыліся сваей дзяржаўнай незалежнасьцю, будучы хутка акупаваныя расейскім бальшавізмам, да другой — народы прыбалтыйскія, што апынуліся ў межах Савецкага Саюзу толькі на пачатку апошняй сусьветнай вайны, і да трэйцяй — сатэлітныя дзяржавы.

Усе гэтыя народы задзіночвае сяньня аднолькавы іхны лёс — бальшавіцкая няволя, як і аднолькавыя мэты — зьнішчэньне бальшавізму, што зьяўляецца перадумовай іхнага вызваленьня. Але палітычная каньюнктура гэтых народаў сяньня зусім іншая ад астальных народаў. Усе сатэлітныя дзяржавы, што апынуліся ў сфэры савецкіх уплываў толькі ў выніку апошняе вайны, фармальна ўважаюцца й сяньня незалежнымі. Дэмакратычны Захад, пратэстуючы супраць іхнай прымусовай саветызацыі, ня толькі ня ставіць пад сумліў прывярненьня іхнай фактычнай дзяржаўнай незалежнасьці ў будучыні, але ў плашчыні дыпляматычнай энэргічна за яе змагаецца сяньня. Прывярненьне поўнай сувэрэннасьці й дзяржаўнай незалежнасьці гэтых народаў наступіць аўтаматычна пасьля зьнішчэньня бальшавізму.

Балтыйскія дзяржавы былі анэктаваныя Савецкім Саюзам у 1940 г., але гэтае анэксыі заходнія дзяржавы ня вызналі, а прэзыдэнт Труман яшчэ 30 студзеня сёлета запэўніў прадстаў-

(Заканчэньне на 4 балоне)

Дапамажэце вашым суродзічам!

Каля 100 тысячаў асталося іх, бяспрытульных, шэрых людзей на чужой, нязычлівай для іх зямлі.

100 тысячаў — апошнія з блізу 5 мільёнаў г. зв. ДП, якія апынуліся ў Нямеччыне й Аўстрыі падчас другой сусьветнай вайны. Ваенная завіруха загнала адных сюды, другіх хапалі немцы проста гвалтам на вуліцы й гналі, як белых нявольнікаў, на катаржную працу для «вышэйшай нацыі», напасьледак трэйція йшлі самі — усёроўна куды, усёроўна зь кім, каб толькі далей ад крывавага камуністычнага тэрору. Кідалі хаты свае, ня раз і сем'і, бацькоў і блізкіх, і йшлі на выгнаньне, на паняверку, ішлі, каб жыць, как жыць і змагацца із сваім найлюцейшым ворагам — чырвоным Крамлём.

Дзякуючы дапамазе міжнародных арганізацыяў, як УНРРА, а потым ІРО, каля аднаго мільёну гэтых людзей выэміґравала ў заакіянскія й эўрапэйскія краіны. Гэтыя людзі ўліліся ў нармальнае жыцьцё, дасягнулі сваю бліжэйшую мэту. Іншыя — вярнуліся ў свае бацькаўшчыны, ня мелі шчасьця гэтыя найбольш нешчасьлівыя зь нешчасьлівых. Паверыўшы зманлівай савецкай прапагандзе або стаўшыся трагічнымі ахвярамі ня менш трагічных памылак акупацыйных уладаў заходніх альянтаў, апынуліся не ў сябе дома, а ў жудасных савецкіх лягерах прымусовае працы.

А 100 тысячаў жывуць яшчэ й да сяньня ў Нямеччыне ў нязвычайна цяжкіх абставінах, нікому не патрэбных і лішніх, ад якіх зь неахвотаю атрасаюць рукі вольныя народы сьвету, у тым ліку і Амэрыка. Яны шчыльна зачыняюць перад гэтымі людзьмі свае граніцы й забарыкадоўваюць іх сотнямі законаў і праверак, праверак і законаў...

А яны сядзяць у няпрыязнай да іх краіне — адныя ў санаторыях, як у Гаўтынгу (1.100 чалавек), хворыя на тубэркулёз і будучыя паміж жыцьцём і сьмерцю, зданыя на ласку й няласку чужога нямецкага мэдыцынскага абслугоўваньня (бо навет свайго мэдыцынскага абслугоўваньня пазбавіла іх нямецкая эканомія). Іншыя жывуць у лягерах, якіх яшчэ налічваецца 104 — жывуць сабе й хлеб нямецкі жуюць, калі змогуць сабе на гэты люксус пазволіць за 35 ням. марак у месяц на ўсе расходы на асобу, 25 марак на сяброў сям'і й 20 марак на дзяцей. Мучацца ў старых дзюравых бараках, ня раз у брудзе й холадзе па некалькі сем'яў у пакоях на двухпавярховых нарах за перагародкамі із старых коўдраў, ня жывуць, а жывацеюць, бо ўмерці з голаду не дазваляе нямецкая, добра зарганізаваная, эканомія.

Хто-ж гэтыя людзі?

А гэта былыя работнікі, вайскоўцы, настаўнікі, сяляне, якія ў мінуўшчыні працавалі для сваей грамадзкасьці, працавалі й на чужых, але ня мелі шчасьця, бо ў непасільнай працы й змаганьні з ворагам страцілі здароўе, асталіся калекамі, або ўзноў-жа мелі няшчасьце быць ахрышчанымі «калябарантамі» зь нямецкімі фашыстымі ці завінілі толькі тым, што адважыліся нарадзіцца і жыць на савецкай тэрыторыі, а яшчэ горш, калі здабылі там вышэйшую асьвету.

Няраз цяжкія й безнадзейныя ўмовы дзеяць разбуральна, пад уплывам якіх зьняверваецца й заламліваецца шэры чалавек і шукае ў гарэлцы нейкага, хоць кароткатрывалага, забыцьця. Прапіваюцца тады з такім цяжарам здабытыя за прададзены зялезны лом, які трэба было выцягнуць з дна ракі, або за старую паперу, якую зьбірала ўся сям'я, не выключаючы й дзяцей, фэнігі. Астаецца тады пустата ў кішані, у хаце й жываце...

Але жыцьцё йдзе сваей дарогай. У змаганьні за яго крышталізуюцца моцныя, вытрывалыя характары, загартаваныя у жыцьцёвых неспадзеўках. Ствараецца нейкая зацятасьць у змаганьні, яна выразна праяўляецца ў грамадзкай дзейнасьці, у доказ чаго — некаторыя нацыянальнасьці, прыкладам украінцы, ня толькі не абмяжоўваюць сваей нацыянальнай працы й прэсы ў Нямеччыне, але яшчэ й разбудоўваюць. Перажываюць нейкі ўздым, працуюць «закасаўшы рукавы», надзеячыся ў вад-

(Заканчэньне на 2 балоне)

Вайна чужымі рукамі

(Заканчэньне)

Ізмаіле на другі дзень — у суботу 26 студзеня адбылася ў Каіры вялізарная дэманстрацыя. Разагітаваная таўпа падпаліла 125 будынкаў, у якіх знаходзіліся брытанскія й чужынецкія ўстановы. Падчас дэманстрацыі й у выніку пажару зьгінула каля 100 чалавек брытанцаў і эгіпцянаў. У цэлым Эгіпце заведзена ваеннае палажэньне.

Сытуацыя ў французскім пратэктараце Тунісе хістаецца між антыфранцускім рухам супраціву й паўстаньнем. Толькі 22 студзеня бой туніскіх нацыяналістых, што дамагаюцца незалежнасьці Тунісу, з французамі пацягнуў за сабой ахвяры ў людзях: 26 забітымі й звыш 100 паранеными.

Ня гледзячы на тое, што антыбрытанскія й антыфранцуская выступленьні арабскіх краінаў прынесьлі Захаду ня мала клопатаў і ўзмоцнілі пазыцыю Саветаў, яны ня змогуць выліцца ў вадкрытую вайну. Раней ці пазьней тут дойдзе да нейкага пагадненьня й наладжаньня нармальных дачыненьняў, тым больш, што новы эгіпскі ўрад Магэр Пашы пачынае апаноўваць сытуацыю й выказваецца за патрэбу прымірэньня з Вялікабрытаніяй. Увесь канфлікт з арабамі, здаецца, скончыцца ўзаемным кампрамісам на аснове, высунутай у ніжняй палаце міністрам замежных справаў Вялікабрытаніі Ідэнам: «Мэтай, да якой імкнецца ангельскі ўрад, ёсьць дасягненьне такога паразуменьня, якое, загарантоўваючы адпаведную абарону зоны Суэцкага каналу, заспакоіла-б і імкненьні Эгіпту». Галоўнай прычынай, што пажар на Блізкім і Сярэднім Усходзе будзе патушаны, ёсьць тое, што ў заплечы арабскіх краінаў няма другога чырвонага Кітаю зь мільённымі масамі ягоных «ахвотнікаў».

ЗАХАД ПЕРАД ДЗЬВЮМА ДЫЛЕМАМІ

Усе тыя палітыкі Захаду, асабліва заходнаэўрапэйскія, якія яшчэ надзеяцца зьліквідаваць загрозу новай сусьветнай вайны шляхам перагавораў із Сталінам ды коштам новых уступак на карысьць Савецкага Саюзу, праводзяць палітыку «собскага самагубства. Чырвоны Крэмль выбраў добрую й нязвычайна выгодную для сябе стратэгію: ня прыймаючы непасрэднага ўдзелу ў ніякай вайне й мабілізуючы ўсе свае сілы для апошняга ўдару, ён шляхам несканчонае дывэрсыі й крывёю нязьлічоных мільёнаў народаў Азыі зможа лёгка, як было сказана вышэй, мілітарна моцна аслабіць Захад і давесьці яго да эканамічнай руіны.

Амэрыка ня можа бесканечна весьці вайны ў Карэі, а таксама ня можа яе й пакінуць. У дадатак, стаіць яна сяньня перад эвэнтуальнасьцю стварэньня камуністымі новага фронту ў Індакітаі, як і адкрытай вайны з цэлым Кітаем. ніі плянаў Мэк Артура.

ІНДАКІТАЙ — ДРУГАЯ КАРЭЯ

Калі-ж да гэтага дойдзе, дык Саветам удасца ўвязаць на Далёкім Усходзе аснаўныя сілы Амэрыкі. Але й на гэтым Крэмль перастаць ня думае, ён прыгатаўляе, выкарыстоўваючы той-жа камуністычны Кітай, другую Карэю.

У Індакітаю партызанскае паўстаньне Ветміну, зь якім французы да гэтага часу, ня гледзячы на помач Амэрыкі, ня могуць даць рады, і ў якім ад 1945 г. страцілі да 200.000 жаўнераў, праўдападобна ў недалёкай будучыні ўвойдзе ў фазу адкрытае вайны з камуністычным Кітаем. Ужо ад трох месяцаў Маа-Тсэ-Тунг канцэнтруе на граніцы Індакітаю не дзесяткі, але сотні тысячаў сваей арміі. Францыя ў сувязі з гэтым адкрыта заяўляе, што пры поўным наступе кітайскіх «ахвотнікаў», яна, бяз выдатнай помачы звонку, ня зможа ўтрымаць сваіх пазыцыяў. Вялікабрытанія, што мае ў гэтай часьці паўдзённай Азыі Гонконг і Маляю, у сувязі з новай загрозай, правіла грунтоўную рэарганізацыю сваей абароны, але толькі для ўтрыманьня нутранай бясьпечнасьці. Дык і на гэтым адрэзку будучага фронту без актыўнага ўдзелу Амэрыкі, падобна, як і ў Карэі, абыйсьціся ня можа.

Апанаваньне камуністымі паўдзённай Азыі пацягнула-б за сабой не толькі страту важных гандлёвых пунктаў і важных жаролаў такой сыравіны, як цынк і каўчук, але таксама мела-б вельмі адмоўныя вынікі ў сэнсе стратэгічным і палітычным. Апанаваньне камуністымі Індакітаю пацягнула-б за сабой утрату Бірмы й Сыяму, а таксама зусім зламала-б прэсьціж Захаду ў Азыі, Афрыцы ды ў Эўропе. З гледзішча на ўсё гэтае абарона Індакітаю мае яшчэ больше значэньне, чымсьці навет абарона Карэі, а таму Амэрыка пакінуць яго собскаму лёсу ніяк ня можа.

БУНТ АРАБСКАГА СЬВЕТУ — ВАДА НА САВЕЦКІ МЛЫН

Другім балючым месцам Захаду ёсьць Сярэдні й Блізкі Ўсход, у якім непасрэдна загрожаныя жыцьцёвыя інтарэсы Вялікабрытаніі й Францыі. У далейшым падзеямі на Блізкім Усходзе ня менш загрожаная й Амэрыка, бо справа іранскае нафты й бясьпечнасьці Суэцкага каналу мае першараднае абароннае значэньне для ўсяго Захаду.

Антыбрытанскі рух у Іране й Эгіпце паўстаў на грунце імкненьняў да поўнага ўнезалежненьня гэтых краінаў ад Вялікабрытаніі, а ў Мароко й Тунісе — ад Францыі, значыцца на грунце нацыянальным. Тым ня менш аднак Саветы й тутака намагаюцца зрабіць сваю справу.

Гэтак эгіпская нацыяналістыя ў сваіх выступленьнях маніфэстуюць прасавецкія сымпатыі й адкрыта дамагаюцца, каб урад у змаганьні з ангельцамі зьвярнуўся за помачу да Савецкага Саюзу. Каірская газэта «Айлі Містры», што зблізкана да ўраду, у нумары за 22 студзеня паведаміла, што генэральны сакратар Арабскай Лігі Азам Паша запрасіў заступніка міністра замежных справаў СССР Маліка адведаць Эгіпт. Адначасна з гэтым Вышынскі на супольным абедзе савецкіх і эгіпскіх дыпляматаў у Парыжы запэўніў Эгіпт аб падтрыманьні з боку СССР у ягоным «змаганьні за сваё вызваленьне».

Ня глядзя на ўсе намаганьні Ангельшчыны давесьці да адпружаньня на Блізкім Усходзе й ня гледзячы на па- Таксама ня ў сілах будзе Амэрыка, як сёлета, кажны год устанаўляць свой бюджэт у астранамічнай суме 85 мільярдаў даляраў, зь якіх 75% прысьвечана на зброеньні.

Калі такі стан патрывае даўжэй ды яшчэ будзе завастрацца, ён няўхільна мусіць прывесьці Амэрыку, а за ей і ўвесь Захад, да поўнае руіны: мілітарнага абясьсіленьня, эканамічнага хаосу й псыхалягічнага заламаньня. А гэта й стварыла-б якраз такое палажэньне, да якога імкнуцца ўвесь час Саветы, а якое пазволіла-б ім на правядзеньне сусьветнай «пралетарскай рэвалюцыі» — на запанаваньне над цэлым сьветам.

Гэтую няўхільную загрозу маюць здольнасьць прадбачыць, на жаль, яшчэ ня ўсе палітычныя дзейнікі Захаду. Асабліва ня хоча зразумець гэтага эўрапэйскі Захад, які, трымаючыся фанатычна сваей пацыфістычнай палітыкі сяньняшняга дня, нeздольны глянуць у будучыню. Затое Амэрыка, якая зьяўляецца адзінай апорай вольнага сьвету й можа стацца адзінай гарантыяй ягонае перамогі, як паказваюць многія сымптомы, гэтыя пляны Савецкага Саюзу ўжо зразумела. Яна-ж патрапіць здабыцца на адвагу й зрабіць з гэтага належныя вывады.

Перад заходнім сьветам стаяць сяньня дзьве дылемы: або дазволіць на поўную перамогу сусьветнага камунізму на ўсей зямной кулі, або ўдарыць ворага па самай галаве. Зьнішчыўшы варожы цэнтр, будзе ўжо лёгка дабіць яго й на пэрыфэрыях. Трэйцяга выхаду быць ня можа.

Таму плян прэвэнцыйнае вайны, ад якой так аднекваецца сяньня ўвесь Захад і дзеля чаго між іншым быў адкліканы прэзыдэнтам Труманам у мінулым годзе Мэк Артур із становішча галоўнакамандуючага збройнымі сіламі ЗН у Карэі, можа хутка стацца актуальным. Ён можа стацца адзінай магчымасьцю ўратаваньня вольнага дэмакратычнага сьвету перад затапленьнем яго сусьветным камунізмам.

Язэп Карапеўскі

Дапамажэце вашым суродзічам!

(Заканчэньне)

плату быць у вырашальную хвіліну на бацькаўшчыне першымі.

У гэтым ліку 100 тысячаў ёсьць і нашыя суродзічы. Ёсьць яны й у санаторыі ў Гаўтынгу, ёсьць на прыватных памешканьнях сярод немцаў, ёсьць і ў лягерах. Гэта — старыя, інваліды, хворыя, дзеці; ёсьць між імі й энтузыястыя, поў-

Патрэбная дапамога матарыяльная й, ня менш ад яе, маральная. У іншых нацыянальнасьцяў ёсьць гэтая дапамога, грамада ня дасьць упасьці, падтрымае ў пару. Гэтак ёсьць у ўкраінцаў, у балтаў, — а ў нас? Ці-ж і мы ня можам зрабіць, чаго вымагаюць ад нас абставіны?

Можа ў будучыні будзе й лепей, можа знойдуцца магчымасьці працы для гэтых нешчасьлівых людзей, але сяньня патрэбная дапамога Вашая, тых, што выэмігравалі. Бо-ж аднолькава хочацца жыць і тым, што ў прыгожых і сьветлых памешканьнях, як і тым, што гібеюць у халодных і брудных бараках. Ходзіць пра тое, каб адчулі гэтыя пакінутыя людзі, што ёсьць паміж суродзічамі яшчэ сэрцы брацкім цяплом сагрэтыя, якія дапамогуць у патрэбе. І я ня веру й не паверу ніколі, што нашыя беларусы, якім суліла доля выэміграваць, з за матарыяльнага дабрабыту (у параўнаньні з жыцьцём у лягерах) забыліся пра ўсё іншае, забыліся сясьцёр і братоў сваіх у лягерах Нямеччыны.

Яны памятаюць пра іх, ня раз і даляр уложаць у пісьмо і часам пачок з прадуктамі вышлюць, — толькі ўсё гэта так неяк прыватна й незарганізавана выходзіць. Ёсьць людзі, што ня ўмеюць прасіць, ня пішуць і не атрымліваюць пісьмаў ні пачкоў, а патрабуюць можа найболей.

Таму хочацца ад усяго сэрца кінуць кліч да жанчынаў, якія прайшлі праз усё пекла вайны, выгнанства, нядолі й нястачы ў часе ваеннай завірухі, — і ўсё гэта перажылі й вытрывалі. А што, каб узяцца? Вось пойдзем, здаецца, з хаты ў хату, ад знаёмага да знаёмага, папросім, зьбяром, як зьбіралі ня раз ў лягерах Нямеччыны, калі спатрэбілася дапамога палонным-зьняволеным, хворым ці наагул патрабуючым. Як зьбіралі фанты, дадзілі лятарэі, давалі самі, ня маючы ніколі лішняга, і дапамагалі, а што, каб гэтак і сяньня? Людзі-ж асталіся тыя самыя, а магчымасьці матарыяльныя ў шмат разоў палепшыліся.

І я ўпэўненая, што не адмовяцца, дадуць усе ў меру сваіх магчымасьцяў. А тады можна будзе зарганізаваць нейкую сталую й сыстэматычную дапамогу, у першую чаргу хворым, інвалідам, дзецям.

Разумеючы ўсе цяжкасьці ў зьдзейсьненьні гэтага пляну, усё-ж хачу верыць, што голас мой не станецца бяз рэха, што пачуюць яго жывыя міласэрныя сэрцы нашых жанчынаў.

Пачатак хіба будзе найцяжэйшы. Бо-ж трэба будзе перамагчы ў сабе ўроджаную пасыўнасьць і крыху саромлівасьці, вырачыся можа не аднаго спакойнага заслужанага цяжкай працай «Вікэнду», можа давядзецца й выслухаць нязычлівае злое слова.

Вельмі было-б добра, каб ініцыятыву ў гэтай справе ўзяла ў свае рукі арганізацыя беларускіх жанчынаў у ЗША. Калі-ж не, дык агульна-грамадзкія нашыя арганізацыі ў кажнай краіне.

Дык у першую чаргу да былых сябровак Жаноцкага Згуртаваньня ў Нямеччыне, да сябровак Жыровіцкага Брацтва апэлюю на гэтым месцы, а таксама й да іншых арганізацыяў і людзей, якім матарыяльны дабрабыт не засланіў вачэй на людзкую бяду й сьлёзы: — дапамажэце!

З. Ст.

«Змораныя»

На балонках нашае газэты зьявілася апошнім часам некалькі артыкулаў, у якіх аўтары падкрэсьлівалі некаторыя недахопы нашай эміграцыі наагул, а некаторых дзеячоў — у васаблівасьці.

Трэба, прызнаць, што заўвагі былі ў васнаўным зусім правільныя й на месцы, а таму нельга зь імі не пагадзіцца. Лічу зусім правільным, не хаваць нашых недахопаў, а сьмела аб іх гаварыць. Гэта можа адзіны спосаб іх выпраўленьня. Аб'ектыўна прэба сьцьвердзіць, што нашая нацыянальная справа й нашае міжнароднае палажэньне шмат узмацавалася й шмат палепшысаля ў параўнаньні зь яшчэ недалёкім мінулымы, але размах працы, ахвярнасьць, ідэйнасьць, з жалем мусім сьцьвердзіць, прынялі адваротны кірунак. Замест збольшвацца, узмацняцца, набіраць разгону, памаленьку слабее тэмпа дзейнасьці і рады актыву радзеюць.

Глянем на гады 1946-47-48; усё жывое й думаючае пабеларуску гарнулася да працы. Недахоп дасьветчаньня выраўноўваўся добрай воляй, палкай ахвотай працаваць, узбагачваць і ўслаўляць імя нашага народу, заяўляць ад імя тых, якія сяньня змушаны маўчаць пад ярмом бальшавіцкага акупанта, што мы народ, які дамагаецца раўнапраўнасьці зь іншымі. Ад маладога школьніка да сівога дзеяча ўсе гарэлі імкненьнем даць нешта ад сябе на нацыянальны аўтар. Ідэалізм, вера й моцнае перакананьне ў мэтазгоднасьць нашага змаганьня — гэта былі аснаўныя характэрныя рысы нашага нацыянальнага руху на эміграцыі . . .

Мінаюць гады . . . Людзі ўладжваюць памаленьку сваё жыцьцё. Рассмакоўваюцца у Мамоне й памаленьку заціхаюць. Сяньня, як ня прыкра, але з сумам мусім сьцьвердзіць, што шмат нашых, нядаўна яшчэ передавых дзеячоў, ужо далёка ня зь пераду, і добра, калі яшчэ іх пабачыш, як плятуцца ў «хвасьце» па старой інэрцыі.

Нехта скажа, што абставіны зьмяніліся, што трэба цяжка працаваць, каб пражыць, і няма часу на грамадзкія абавязкі. Можа яно й так, але колькі-ж тых, неперадавых апынуліся ў тых самых абставінах, але аднак ім сяньня абставіны дазваляюць на нацыянальную й грамадзкую працу. Прычына, думаю, крыху іншая. Аб'ектыўны глядач назваў-бы гэнае зьявішча зусім проста — «змораньнем». Нельга з гэтым не пагадзіцца. Ёсьць уражаньне, што некаторыя нашыя дзеячы й перадавікі ў розных галінах нацыянальнага жыцьця выгарэлі, прытухлі, папросту змарыліся. У іх быў у свой час запал, ідэйнасьць, але не хапіла вытрываласьці вытрымаць «на пасту» да канца. Запал і ідэйнасьць неабходныя ў пачатку кажнай справы, але вытрымка, цягавіласьць неабходныя, каб давесьці справу да канца.

Глянем-жа сяньня на наш Парнас і мы пабачым там, што й слаўныя некалі журналістыя сяньня ў бальшыні із зломаным пяром, няздольныя нат на маленькі газэтны артыкул ці хоць-бы на'т кароценькі рэпартажык, паэты, якіх пакінула муза, палітыкі, зышоўшыя зь вялікага на хатні разьмер, грамацкія дзеячы без грамадства ды шмат іншых, ім падобных.

Бяда аднак ня зусім у гэтым, бо ўсё-ж маем мы й «цягавітых», хоць можа ня так «высокакваліфікаваных», на «арлоў», але часамі звычайных «птушак»,

(Заканчэньне на 4 балоне)

ЯКУБ КОЛАС

НОВАЯ ЗЯМЛЯ

(6)

ПАЭМА

VIII

СЬМЕРЦЬ ЛЯСЬНІЧАГА

— Міхал! Міхале! О, Міхале! —
Пачуўся голас як-бы здаля
Каля зямлянкі ранічкою
часты стук у шкло рукою.
— Ўставай, Міхале, адзявайся!
— А хто там? — Я! хутчэй зьбірайся:
Памёр лясьнічы наш! — Ды можа?! —
Міхал ускочыў — моцны Божа!
хто-б мог думаць, спадзявацца!
Ужо стаў ачуньваць, папраўляцца . . .
Каб хто сказаў — ня даў-бы веры,
Ды то аб'езчык, пан Ксавэры,
Прынёс навіну гэту, смуту!
— Няхай пан зойдзе на мінуту! —
Сказаў Міхал, адмкнуўшы дзьверы.
Цераз парог ступіў Ксавэры,
Зайшоў у хатку і спыніўся,
Бо зразу ў ёй ашаламіўся,
дальш ня ступіць ні на крок:
Ня хатка — проста катушок,
Няма дзе нават павярнуцца,
Як у сабачай цеснай будцы.
— Сядайце дзе-нібудзь, сядайце ! . .
Эх, хата наша, выбачайце . . .
Міхал калодку падстаўляе.
Уздыхнуў Ксавэры і сядае.
То быў мужчына ўжо паджылы.
— Ах, мой ты Божа добры, мілы!
Ото-ж як выбраўся ён скора!
Яшчэ ня дальш, як пазаўчора,
Са мною гутарыў, сьмяяўся
I аба ўсім мяне пытаўся, —
Міхал гаворыць і ўздыхае.
— Ох, браце: сьмерць не разьбірае
I не глядзіць нікому ў зубы:
Гадзюкаю,, брат, з-пад падрубы
Зьнячэўку ўсадзіць сваё джала;
Ці многа жыў, ці жыў ты мала,
Ці ты багаты, ці ты бедны,
Ці ты зайздросны, ненаедны.
Жывём, клапоцімся і дбаем,
I усе нарэшце паўміраем,
У нейкім згаснем лятуценьні,
Сказаў Ксавэры ў засмучэньні.
— Так, гэта так, пане Ксавэры!
Ужо загатованы паперы
Для часу нашага сканаьня
Рукою божага ўзысканьня,
I ходзіць цень, як цень, за намі, —
Сказала Ганна са сьлязамі . . .
— Ну, я гатоў! — То пойдзем, браце,
Паплачам хоць па сваёй страце. —
Міхал з Ксавэрым вышлі з хаткі.
Сьвітала ўжо. Дзесь каля гаткі
У гэтым досьвітку маўклівым
Крычалі гусі праразьліва,
Нястройным хорам гергеталі,
Ды качкі з шумам пралялі,
I кнігаў нёсься плач з лукі,
Ў глыбі лясоў цецярукі
Ужо зачыналі свае токі,
Усход віталі агнявокі,
Віталі шчыра і натхненна.
Міхал з Ксавэрым задуменна
Ішлі праз лес, ішлі маўкліва,
I толькі зрэдка сіратліва
Па слоўку ўроняць два служакі.
— Няма ў нас пана, небаракі! —
Міхал гаворыць. — Так, няма.
Жыві ўдава цяпер сама, —
Сказаў Ксавэры задуменна.
— Ну, пане, будзе цяпер зьмена,
I пойдуць новыя парадкі, —
Міхал выказвае дагадкі.
— А пэўна, будзе талачэчка,
Не бяз таго ўжо, чалавеча! —
Ўздыхнуў Ксавэры: — Шкода пана!
Ох, бедны: выбраўся зарана!
А жыць-бы мог, такі здаровы, —
Ну, чалавек, як корч дубовы . . .
Пажыць-бы трохі яму трэба,
Пакой душы яго і неба. —
Так гаманілі, йшлі прасткамі
То праз лужок, то хвайнякамі —
Ўсяе дарогі на поўмілі,
Ішлі, нябожчыка хвалілі,
Як чалавека й служку князя,
Як і вядзецца ў такім разе.
— Ня дрэнны быў: і распытае
(Хай са сьвятымі спачывае),
Як ты жывеш, ці ты галодны,
Ці ты спачыў, — як бацька родны,
Але сказаць, яшчэ ня ўсякі!
А прынясеш што — без падзякі
Ужо ня выпусьціць, заплаціць,
А на дарэмшчыну ня кваціць.
— Быў чалавек ён справядлівы,
Не фанабэрысты, праўдзівы! —
Ксавэры так-жа пацьвярджае.
На тым гаворка іх змаўкае.
Ідуць маўчком яны; заняты
Сваімі думкамі зь іх кожны.
— Так. У лясьніцтва кут парожны,
Куток паквапны і багаты,
Не застаецца, ня згуляе,
Паноў к сабе ён прыцягае,
Як рыб гарох у вазярыне,
I кажны ў замку службу рыне,
Сюды пацісьнецца з ахвотай,
I ня прыедзе, а пяхотай
За душу мілую прычхне, —
Міхал з сабою развражае.
— Але хто-ж гэта месца займе?
Яно-то праўда: ў панскай плойме,
Сказаць, ня будзе нястачы,
Ды гора ў тым — адзін лядачы,
Другі бяз клёпкі, трэці злосны,
Несправядлівы, бязьлітосны,
Як, вось, напрыклад, Табартоўскі
Або падлоўчы, пан Бялоўскі.
Назначаць гэтакага ката,
Тады запахне свая хата.
Нажыць дабра ня надта лёгка,
Яно, як шклечка тое, крохка:
Ледзь да яго ня так кранешся,
I з чарапкамі застанешся.
А ліха прыйдзе без падмогі,
Бо ліху — бітыя дарогі
I ўсюды сьцежкі яму вольны,
То роўна-гладкі, то вакольны,
Не абміне яно нікога. —
Так сьмерць лясьнічага старога
Міхала моцна ўскалыхнула
I ўсё ўверх дном пераврнула.
I тут у першы раз Міхала
Вось гэта думка напаткала:
Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
Каб з панскіх выпутацца пут,
I там зажыць сабе нанова:
Свая зямля — вось што аснова!
Ўставала сонейка з-за лесу
Скрозь тонкіх хмарачак завесу
I ўсюды косы раськідала,
А ўсё жывенькае вітала
Усход яго на ясным небе
I, клапатком аб пільным хлебе
Калі Міхал і пан Ксавэры
Дзянёчак новы зачыналі,

Мае пажаданьні «Бацькаўшчыне»

...этак ужо зьбеглася (на эміграцыі ўсё ...ае), што вельмі доўгі час не бачыў ...арускіх газэтаў. Таму неяк асабліва, ...ычайна быў узрадваны, калі натра...на свае газэты, сярод якіх была й ...цькаўшчына».

...дык як-жа ня ўзрадвацца! Яны-ж ...анесьлі не адно навіны, але разам ...іжкалі-ажывілі й цэлы рой, процьму ...уцьцяў, а зь імі нанова загаманілі ...ўжо ў мільённы раз, бо ні на часіну ...акідаюць яны падарожніка-эмігран... ўспаміны-думкі пра найсакраман...нейшае для чалавека, пра родную, ...ім і нічым незаступную Бацькаў...чыну-Радзіму, закаваную ў ланцугі ...волі. Вунь як добра, праўдзіва — пра...іва сказала паэтка:

...Там сяньня ўзьвівы сьнежнае завеі,
...вухам страшна гэты сьпеў лавіць...

Ды й ці нашая віна, што мы сяньня ...ушаныя падарожнічаць у сьвеце ўс...мінаў — сноў зь няўтойным пачуць...болю. Мабыць, наканавана ўжо нам ...цьць адно візьі:

Беларусь, Беларусь зялёная,
Палыменны, балючы сон.

...А цяга да свайго роднага гэткая не...льная й няўмольная, што чалавек ...вет гатоў вачыма ўядацца ў чужы ву...лны напоўп, упівацца ў рысы твараў, ...ыглядацца навет да хады, да вопрат...да захоўваньня, каб хоць па гэтым ...сьцергачы, пазнаць свайго ды ўсьцешыцца, як кажуць, каб хоць словам перакінуцца. Дык ня дзіва, што й газэта, якая так сама адно з гэтых сваіх, выклікае ўзрушэньне ды чытаеш яе з гэткай хцівасьцяй, налапам.

Кажнага з нас можа адно цешыць, што «Бацькаўшчына», як кажуць, акрыяла ды выходзіць штотыдзень. У сувязі з гэтым хачу выказаць тут колькі сваіх асабістых пажаданьняў.

Газэта — вялікая й паважная справа. А ў нашых эміграцыйных умовах ейная роля, як лучніка чалавека з жыцьцём, з грамадзтвам набывае нявымоўнага значаньня. Мы расьцярушаныя па ўсім сьвеце, нашых людзей лёс пазакідаў недзь ведама куды. Скрозь чужына! Газэта ў пэўнай меры лучыць нас між-собку. Роля газэты ніяк ўжо больш павялічваецца, бо мы ня маем іншага пэрыядычнага друкаванага слова, якое ў меру магчымасьці мусіць хоць крыху заступіць газэта.

Для нас газэта ня толькі інфарматар важнейшых палітычных падзеяў. **Газэта самперш вялізманы нацыянальны дзейнік, важнейшы дзейнік у намаганьні да нашага нацыянальнага задзіночаньня, ёй належыць першарадная й першая роля ў змаганьні за крышталёвасьць нашай незалежніцкай нацыянальнай ідэалёгіі, у справе падтрыманьня й захаваньня тут на чужыне нашых нацыянальных традыцыяў, безь якіх мы нацыянальна ўсьмерцімся** (а нашыя традыцыі не адно беларуская верашчака з блінамі).

Гэткія вымаганьні мы мусім ставіць да газэты й разам паважна ды настырліва апэляваць да нашага грамадзянства пра кончую патрэбу як найшырэйшага й дзейнага падтрыманьня свайго друкаванага слова.

Што да «Бацькаўшчыны», дык уважаю яе за найбольш паважную беларускую газэту на эміграцыі. Нацыянальна-незалежніцкая прынцыповасьць — было самым характэрным для «Бацькаўшчыны». Гэтая прынцыповасьць становіць неад'емную рысу важнейшых артыкулаў (мінаем некаторыя прыкрыя вылучэньні), якія друкуюцца на балонках «Бацькаўшчыны». Зусім слушна рэдакцыя ўважае за найвялікшае заданьне газэты — задзіночыць нашую эміграцыю.

Але нам хацелася-б, каб газэта была яшчэ лепшай і што да зьместу і што да вонкавага выгляду.

Галоўная загана газэты — абмежаванае кола супрацоўнікаў. Трэба адшукаць нейкія спосабы-сродкі, каб павялічыць аўтарскі склад газэты, каб газэта абрасла людзьмі, што зробяць яе больш цікавай, зьмястоўнай, уразнастайняць матар'ял, пашыраць тэматыку. Неяк дзіўна й прыкра, што ў газэце не бяруць удзелу нашыя літаратары — ці мо' таму, што ім, адважымся сказаць, бракуе галоўнага — пачуцьця грамадзянскае адказнасьці за заўтрашні дзень.

Часамі ў «Бацькаўшчыне» матар'ял друкуецца бяз пэўнае сыстэмы. Уважаю за патрэбнае трымацца належнае сыстэматызацыі матар'ялу, што заўсёды надае газэце адменны вонкавы выгляд і пэўным чынам засяродкавае чытачову ўвагу.

Конча патрэбна, каб у газэце былі заўсёднымі некаторыя аддзелы. Прыкладам, кажнага з нас нязвычайна цікавіць, бадай, самая невялічкая вестка зь Беларусі. Часамі даведваемся, што робіцца на Бацькаўшчыне не з свае, а з чужое прэсы. Варта ўвесьці хоць невялікі куток «Весткі з Бацькаўшчыны», каб ня час-ад-часу, а ў кажным нумары і на пэўным месцы друкаваць весткі з Беларусі, навет рабіць агляды артыкулаў на пэўную тэму. Чаму-б ня пісаць пераднова да іншых артыкулаў, як гэта сёй-той робіць, на тэмы нацыянальнага жыцьця нашага народу ў маскоўска-бальшавіцкім «раі». Тэматыцы з Бацькаўшчыны рэдакцыя мусіць аддаць куды больш увагі, як да гэтага часу. Бо хто-ж іншы, як не газэта, мае дапамагаць нам трымаць непарыўную духовую лучнасьць з сваім народам?

Было-б карысна, хоць-бы раз на месяц, выдаваць літаратурную балонку. У нашых умовах гэткая балонка мае асаблівае значэньне. Яна павялічыць абсяг газэты, заахвоціць супрацоўнічаць у газэце пісьменьнікаў, панясе іхныя творы да чытача, ды адыграе вялікую ролю ў нацыянальным узгадаваньні нашае эміграцыі, асабліва моладзі.

У сувязі з тым, што газэта стала тыднёвікам, варта ўвесьці тыднёвыя агляды-падборку кароткіх інфармацыяў пра важнейшыя палітычныя падзеі ды здарэньні.

Асаблівая, мо' галоўная ўвага мусіць быць зьвернутая на руплівае рэдагаваньне ў самым шырокім значэньні гэтага слова, без чаго няма й ня можа быць газэты, зробленай з густам. Гэта пазбавіць ад непатрэбнай расьцягнутасьці артыкулаў, зьберажэ месца ў газэце, зробіць матар'ял ідэйна й літаратурна больш вартным, больш данёслым ды будзе вучыць пісаць тых, хто піша ці жадаў-бы пісаць у газэту.

Для нас мова не літаратурны прысмак, а нашая ідэйна-нацыянальная зброя. Вось чаму ўважаем за сьвяты абавязак (і самперш для рэдакцыі газэты) дбаць пра ейную чысьціню й незаплямленасьць, шанаваць ды галубіць роднае слова, разьвіваць яго ды ўзбагачаць, каб было яно апраметным ды зьнішчальным для ворага, павучальным ды заклікальным для сваіх. Бяз культуры мовы мы можам апынуцца ў палоне благога правінцыялізму ды жаргону.

Абыйсьціся бяз прыкладаў тут нельга. Аж у двух нумарох «Бацькаўшчыны» друкавалася «Сустрэча зь лягерамі» Падарожнага. Аўтара я ня ведаю, ды й ня ў гэтым справа. Чалавек, відаць, хацеў напісаць нарыс. Намер добры, добрая тэма. Ці адзін запраўды мастацкі, усхваляваны нарыс можна напісаць не пра адну, а тысячы трагэдыяў нашых суродзічаў у Нямеччыне ды ці адну ўедліва-зласьлівую сатыру пра абыякавасьць таксама не адзінак, што дапялі ў краіну даляра. Пра гэта варта ня толькі пісаць, а крычаць на поўны голас.

Абмежаванасьць месца не дазваляе запыніцца на разглядзе нарысу. Адно зацемім, што варта было больш удумліва папрацаваць над закранутай тэмай. Прыкладам, частка нарысу «Людзі ў умане». Нашто, каму яна патрэбна гэтак напісаная, што яна гаворыць? Ці варта было акцэнтаваць на «дэнатурат і лякероўку», пішучы пра старых людзей, што жывуць у вадмысловых лягерах? За вонкавым «туманом» трэ' было ўбачаць больш істотнае — абрабаванае ды адабранае жыцьцё тым-жа прайдзісьветам з чырвонаю зоркаю на лобе, які гвалтам адабраў Бацькаўшчыну і ў маладзейшага пакаленьня ды змусіў сяньня безхацінцамі туляцца на усёй зямной кулі. Гэтыя старыя — гэта-ж нашыя бацькі, а сяньняшняя іх трагэдыя — нашая супольная трагэдыя. Павярхоўнасьць прывяла аўтара да ўбоства. Грэблівасьці мы бачым даволі, яна ўселася ў косьці. Мы хочам бачыць павагу да тых, хто мае на яе права.

Гэта адна мімавольная заўвага. Хачу зьвярнуць увагу на мову. Вось колькі прыкладаў: «**таўпу** людзей», «**старычкі**», «**у сталоўцы**», «**штось у родзе** стала», «**штосьці ў родзе** прытуліліша», «пачынаюць **высказвацца**», «**напрасна**», «**роскаш**», «**на днях** эмігруе», «**рты**», «**уканцы**», «нас... **прадстаўляе** жонцы» ды інш. Адкуль усё гэта? Гэта-ж чысьцюсенькая расейшчына, якая перватварае нашую мову ў нейкі бязгустоўны жаргон. Няўжо яна мусіць давацца ўзнакі навет на эміграцыі, дзе кажны можа пісаць ня з прынукі, не на загад, а паводле собскага сумленьня. Нідзе ня чулі ды й ня чыталі, што можна гэтак сказаць пабеларуску: «старанае ўзгадаваньне навет **у так некарысных абставінах**».

Або вось «вобразносьць», пазбаўленая жывога сэнсу: «вочы чуць ня вывалваюцца з арбітаў, **вылятаючы ўперад**», «**кашулі распачліва махалі рукавамі**». Чаму-б тады, скажам, не напісаць, праўда, для перадачы ўжо «бадзёрага» настрою: «нагавіцы задзёрыста дрыгалі калашынай». Гэта-ж сьмеху варта. Верым Падарожнаму, кажучы ягоным «стылем»: «абраз, які бачым перад сабой, **не даецца апісаць**» і таму «разьвітваемся з **разгутаранымі** гаспадарамі» (а мо' — **гаваркімі**?).

Можна было-б прывесьці цімала прыкладаў зь іншых артыкулаў. Няўжо ўважаць за беларускія ўсе гэтыя «**спор**», «**склонны**», «**абідзіць**» ды інш.? У нас ёсьць слова «спор», але мае зусім адменны сэнс ад расейскага «спор» (нашае — «спрэчка»). Чаму «раз у тыдзень», Нашая літаратурная мова ведае адно гэткую форму і зразумела чаму. Не пабеларуску будзе «**згары** можна асудзіць», «**заспакойваць** духовыя патрэбы»... Гэта жыўцом з польскага.

Ня трэба даводзіць, што ўсе гэтыя «ягадкі» ня з нашага лесу-поля. Дык ці варта ўпіхаць іх у наш моўны лад ды праз гэта засьмечваць мову, калі мы маем гэткае моўнае багацьце, прыдбанае народам ды нашым прыгожым пісьменствам?

Згаданыя прыклады гавораць пра тое, што рэдакцыя не заўсёды аднолькава дбае пра мову, што некаторыя рэчы трапляюць у газэту без належнага рэдагаваньня, а гэта псуе агульны **стыль** «Бацькаўшчыны».

(Заканчэньне будзе)

«Зморанья»

(Заканчэньне)

...людзей з моцнай воляй, вялікай верай і ...ычайнай беларусу вытрываласьцю, ...я давядуць да пераможнага канца ...чатую справу. Бяда ў іншым. Усе гэ...я «зморанья» шукаюць апраўданьня ...ей бязьдзейнасьці не ў сябе самых, ...ў іншых, ці ў вабставінах. Не гавару ...а людзях засьлепленых Мамонай, якія ...пагоні за ёю пасьвяцілі сябе, жонак ...дзяцей. Адзінай іх мэтай — гэта ...омы. Часамі паўстае ўражаньне, ...о яны зьбіраюцца жыць яшчэ адзін ...ек. Аб іх зрэштай ня варта ўспамінаць, ...чны страчаныя ня толькі для нас і ...людзкасьці, але й для самых сябе. Сярод гэтых «зморанных» можна пабачыць чэсных людзей, якія шчыра прызнаюцца, што больш ня могуць ці ня ...чуць. Трудна, нічога не парадзіш. Але ...сь ёсьць катэгорыя людзей, якім на...агаюцца ашукаць сябе ды іншых. За...ць, што ён ня хоча больш працаваць ...амадзка, неяк ня выпадае з гледзішча ...ця-б на мінулае, калі сам іншых па...маў да нацыянальнай працы, за...вочваў, пхаў на шлях змаганьня. Ды ...' часамі з гледзішча на эвэнтуальнае ...дучае, каб «месца» ня страціць. Дык ...сь гэтая катэгорыя людзей мае даволі ...спосабаў для самаапраўданьня. ...сь некалькі, для прыкладу ўзятых з ...эспандэнцыі, заяўленьняў ці публіч...ых выступленьняў: «На бацькаўшчыне ...йдуць сілы зь беларускага народу, ...асярод людзей, якія сяньня змагаю... й будуць змагацца, кіраваныя лю... да бацькаўшчыны й ненавісьцю ...ворагаў. Калі-ж паміма гэтага беларускаму народу ня будзе суджана перамагчы там, дык ня зробіць гэтага й некалькі дзесяткаў тысячаў эмігрантаў з кучкай інтэлігенцыі».

Так, гэта запраўды вернасьць тым ідэалам, за якія сяньня там змагаюцца! Ці іхняе змаганьне не забавязвае яшчэ больш эміграцыю, якая ў сотні разоў у лепшай сытуацыі, да падтрыманьня тых, што праліваюць крэў? Ці-ж ня наш абавязак успамінаць аб гэтых тым, якія мо' ў будучыне будуць вырашаць лёс народу, за што змагаюцца й гінуць нашыя браты на бацькаўшчыне? Забыўся відаць той, якую ролю згулялі Бэнэш і Масарык у мінулую вайну ў чэскім вызвольным руху, уплываючы на апінію Захаду, і ў якой меры гэтым спрычыніліся да асягненьня незалежнасьці? Сяньня нам трэба сотні й тысячы такіх Бэнэшаў ды Масарыкаў, бо кажны сьведамы беларус, дзе-б ён ня быў, можа ў большай ці меншай меры выконваць ролю ўспомненых вялікіх патрыётаў.

Іншы піша: «Не магу сяньня быць сябрам арганізацыі, бо ейны старшыня назваў мяне... Гэта ёсьць недапушчальна й я адыходжу...»

«Ведаеце, не магу больш працаваць грамадзка, бо ў нашых вярхох шмат людзей бязідэйных, няздольных весьці такую адказную працу, як вызвольнае змаганьне. Калі-б я...»

«А вы, спадар, пытаю, ідэйны, і як відаць, ведаеце, як пакіраваць працай?» «Зразумела!» Дык калі ласка, то й гатоў уступіць Вам сваё месца.» — ?.!. Няма адказу.

Але ёсьць яшчэ іншыя тыпы, патрыёты, прававерныя, непамыльныя. Ціхенька сядзяць і чакаюць «памылак». Зьбіраюць, каб «ударыць» пры першай нагодзе. Яны ня мыляюцца, бо нельга памыліцца, калі нічога не рабіць.

«Вы чулі? Міністар замежных справаў вёў перагаворы з палякамі. Гэта-ж недапушчальна. Наяўная здрада. Я, як сябра Рады, не магу гэтага перанесьці. Не магу несьці адказнасьці, выступаю з Рады і ... нічога не раблю».

«Прадалі Беларусь расейцам!» Якая нагода адмахнуцца ад усяго рукамі й нагамі. Прынялі ўдзел у перагаворах! Я ідэйны, няспляміены, неабмыльны, адданы, любячы бацькаўшчыну безгранічна, не магу адказваць за гэны крок. Я выходжу!» (Голас дрыжыць, раздзірае кашулю на грудзях): Выходзіць.

Вярнуўшыся да хаты, пацірае рукі з задаваленьня. Няхай цяпер хто скажа, што ён не патрыёт? А тымчасам і клопату пазбыўся. Супакой.

Ды шмат іншых прыкладаў жывых, зь якімі мы сустракаемся на кажным кроку, сьветчаць аб гэткіх ненармальнасьцях.

Чаго шумець? Змарыўся, браток, адыходзь, ня крыўдзі! Аддыхні, але не перашкаджай! Мейце чэснасьць, Спадары «Зморанья»! У нас хопіць сьвежых сілаў, каб закончыць пачатую працу й выканаць нацыянальны абавязак і за сябе і за Вас. Гэныя сьвежыя сілы дапамогуць зьняможанаму народу ў ягоным змаганьні за наш вялікі ідэал — Незалежную Беларусь!

А вы адпачывайце, зморанья... але будзце чэснымі!

С. Турцоў

...вы шлі маўчком на двор кватэры.
На горцы ціхай, нявысокай,
Каля засьценку недалёка,
...к дарогі, ў глыбі саду
...аяла панская пасада.
...эсторны, роўны двор, вясёлы
...усёды повен быў жывёлы,
...адзілі куры зь пявунамі
...кампаньні важнай зь індыкамі,
...распусьціўшы хвост мятлою,
...вук паходжаваў за павою,
...к пан вяльможны, радавіты;
...кутку двара каля карыта
...ныралі качкі-плюскатухі;
...прук заможны, лапавухі
...лацыраваў паміж платамі
...сьмешна ўськідаў кумпякамі,
...алі, часамі, каля дому
...н гукне, рохне пасьвіннаму,
...даецца, так, бяз дай прычыны, —
...спрыт пакажа япручыны.
...ка... і кухні пад аконцам
...абакі грэліся на сонцы —
...аксама панскае пароды,
...ім было жыцьцё, выгоды.
...ылі тут розныя будынкі:
...уменцы, гумны і адрынкі,
...лявы, і стайні, і аборы,
...абра, набытку былі горы.
...ле ў машыне гаспадарскай,
...ы ў хітрай штучыне сьлясарскай,
...губілась шруба — стоп, машына! —
...яждана выпала пружына!
Рыгор — хурман хадзіў бязь дзела,
...ыпярша пабурківаў нясьмела,
...япер нікога не баяўся,
...адзіў і лёганька хістаўся:
...н трохі стукнуў — ці ня згора?
- А ты чаго тут, мухамора? —
...ыгор насеўся на кухарку: —
...ось калі дам табе па карку!..
— Пайшоў! адстань! ото брыдота!
Прылез, як лысы чорт з балота!
— Эх, Наста! хочаш? а ну ў скокі? —
Сказаў хурман і ўзяўся ў бокі,
Нагою тупнуў, закруціўся,
Прысеў і ўстаў, заварушыўся —
І то ўстае, то прысядае
І ногі ўперад выкідае.
— Бадай ты спух! ото распуста!
А каб табе было, гад, пуста!
Няма ні сораму, нічога...
Ды пашануйся ты хоць Бога,
Хоць-бы граху ты пабаяўся! —
Але Рыгор ня сунімаўся.
— Скачы, валяй і ты, Настуля!
Што-ж? Калі гулі, брат, дык гулі!
Пан пойдзе ў рай, а мы з табою...
А мы — у бухту з галавою!
— Пакінь: нябожчык там, у доме!
Пайдзі праспіся на саломе!
І пані, вунь, глядзіць! — Што пані?!
А я-то хто? пане хурмане,
Дурное заткала ты знаеш?
Чаму Рыгорам называеш?
Заві меня... вяльможны пане!
— Няхай цябе зямля апране!
Ото брыда, ото завала:
Яшчэ каб панам называла!
Ці чулі, людзі? Налізаўся,
Як той сабака на разьніцы!..
— Но, но! бо пойдзеш без спадніцы.
— Адстань! слатою навязаўся.
«На паліцы сланіна,
Пані пеўня смаліла,
А ў рандэльку стаіць лой,
Але ня твой, не — ня твой!»
А там, у доме было гора:
Жывы і крэпкі яшчэ ўчора,
Сягоньня быў ён нярухомы,
Глухі на ўсё, чужы жывому.
З засьценку шляхта пасхадзілась
І ў тым пакойчыку таўпілась,
Дзе пан ляжаў у дамавіне.
— Няхай зь сьвятымі апачыне! —
Уздыхалі, хрышчучысь, старыя,
Схіліўшы галовы сівыя.
— Ня дрэнны пан быў! — гаварылі
І ціха, стала адхадзілі,
І доўга кучкамі стаялі.
Паны сюды зьяжджацца сталі.
Ўсе лясьнікі былі ўжо ў зборы
У лепшым стражніцкім уборы:
У новых куртках са шнурамі,
А на грудзінах са знакамі,
На шапках «Р» было з каронай,
Каўнер стаячы і зялёны.
Яны па два, па тры стаялі
Каля паркану і чакалі,
Пакуль куды іх не паклічуць,
Стаяць і пану раю зычуць,
Збавеньня вечнага жадаюць,
Гавораць ціхенька, ўздыхаюць.
Паслухаць збоку іх, здавалась,
Што ўсе яны пасірацелі,
А што на сэрцы яны мелі,
То тое ў сэрцы і засталась.
Ды толькі мушу я прызнацца:
Як пачынала ўжо зьмяркацца
І пана з плачам пахавалі,
Ўсе лясьнікі пілі, гулялі,
А потым сталі барукацца.
Амброжык Кубел разгуляўся,
Са ўсімі шчыра цалаваўся
І кварту трэйцюю ўжо ставіў,
І ўсёю выпіўкаю правіў.
— Браткі! гуляйма! Калі сьвята,
Дык трэба выпіць хоць багата! —
Крычаў Амброжык: — Сьцеражыся! —
Кіўнуў ён носам на Міхася,
І чарка ёмка паднялася.
— Эй, цётка Хрума! ўраз зьявіся! —
Вайшла і Хрума ў старым чэпку.
— Здарова, цётка! як ты крэпка?
— От! — кажа Хрума і сьмяецца,
Такою добраю здаецца,
Што наш Амброжык увесь тае
І Хруму маткай называе.
— Ах, пан Амброжык! на што жарты?
— Галубка мама! стаў дзьве кварты! —
Ўсе ажылі і разышліся.
Такія мовы паліліся,
І пахвальба пайшла такая!
— Падаць мне Тэша! — Лось гукае: —
Я разарву яго вантробу,
Бо сьвет гарыць зь яго, хваробы!
Падайце: вырву яму вусы
За ўсе даносы, за падкусы! —
Абрыцкі — Тэш быў такі зь нюхам,
Ад Хрумы зызнуў адным духам.
Быў позны час, як «цётку» Хруму
Зь вясёлым шоламам і ў тлуму
Лясная стража пакідала.
Ў яе ачох зямля скакала,
І месяца бліскучы крайчык
На небе пстрыкаў, як той зайчык.
Счакаўшы трохі, разышліся,
І песьні зараз панясьліся
То тут, то там і лес будзілі,
Як-бы ваўкі там галасілі.
«Ой пайду да дому,
Не скажу нікому.
Ды зарэжу ката,
Бо наш кот — сірата», —
Пяяў Амброжык за балотам,
А Пальчык сыпаў, як-бы шротам:
«Будзе мяне жонка біць,
Няма каму бараніць».
Міхал сьпяваў баском спавагу,
Як-бы каваў ён словы шлягай:
«Добра мера, хоць бяз грошай,
Абы празьнічак харошы!»

(Далей будзе)

Перарэклямаваная імпрэза

Ад 21 да 22 студзеня адбывалася ў Лёндане канфэрэнцыя г. зв. Эўрапэйскага Руху, зарганізаваная камісыяй Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы. У канфэрэнцыі брала ўдзел каля 150 прадстаўнікоў палітычных эміграцыяў і палітыкаў Заходняй Эўропы.

Канфэрэнцыя, як і кажная такая імпрэза, давала шырокія магчымасьці выязычвацца розным аратарам і не аратарам, дык і на гэтай пераліваліся цэлыя азёры аратарскай вады, але вынік — што найменш быў сумніўны.

Мэтай гэтага зьезду, як заявіў сп. Бэдінгтон Бэрэнс — старшыня камісыі, было «апрацаваньне плянаў на будучыню ў галінах грамадзкай, палітычнай, гаспадарскай, прамысловай і культуральнай для ўсіх краёў Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы пасьля вызваленьня з пад расейскага панаваньня».

Можна-б пахваліць гэтыя, выбягаючыя ў далёкую будучыню, праекты, каб гэныя праектадаўцы выяўлялі рэальны пагляд на сяньня й бліжэйшую будучыню. А тымчасам сп. Бэрэнс на запытаньне, як разумець сказ — «як будуць вызваленыя з пад расейскага панаваньня», адказаў, што, барані Бог, канфэрэнцыя ня мае на мэце прапагаваньня вайны дзеля вызваленьня гэтых краёў, але думае, што знойдуцца іншыя спосабы да адбудаваньня іхняй незалежнасьці, што заходныя палітыкі ўсё-ж такі перадыскутуюць із Сталінам умовы трывалага міру й што гэныя ўмовы будуць абымаць таксама і палітычную вольнасьць краёў за зялезнай заслонай...»

Спадару Бэрэнсу ўторыў другі ангельскі палітык — кансэрватысты сп. П. С. Эмэры, які быў старшынёй канфэрэнцыі: «... уважаю за рэч зусім магчымую, што Расея аднаго дня прыйдзе да перакананьня, што варта пакінуць краі Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы, каб яны стварылі буфар...» (?)

Адным словам — старая песьня і не на новы лад. Проста чакаць, аж бацьку Сталіну прысьніцца анёл і загадае пакінуць заграбленыя землі, а Сталін, абудзіўшыся, чым хутчэй выканае гэны загад.

Сумай чатырохдзённай малацьбы языкамі былі вынесеныя рэзалюцыі, найважнейшая зь якіх, бо палітычная, кажа: «Эўропа ня можа астацца на палавіну вольнай, на палавіну паняволенай. Насьмешкай зьяўляецца гутарыць аб трывалым міры, калі сто мільёнаў эўрапэйцаў енчаць у няволі. Трывалыя суадносіны з Савецкім Саюзам будуць дасягнуты толькі тады, калі нацыянальная незалежнасьць і асабістая вольнасьць будуць устаноўлены ў краёх Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы і калі яны, маючы магчымасьць карыстацца із сваёй незалежнасьці, задзіночацца з рэштай эўропэйскай сям'і.»

У канцы дэклярацыя кажа: «Бясьпечнасьць можа быць дасягнута толькі цераз адзінства, калі краіны й народы Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы будуць вольныя, абавязкам іх будзе злучыцца у якнайшырэйшых рамах задзіночанай Эўропы, якую забавязваемся збудаваць так, каб магла запэўніць свой гаспадарскі развой, карыстаньне з вольнасьці й грамацкай справядлівасьці, а так сама — супольнай абароны.»

Прыгожа! Толькі... што гэта ўсё было ўжо сотні разоў сказана, напісана, абвешчана... І ўсё гэта мае быць тады, калі натхнёны добрым духам альтруісты — Сталін згодзіцца на гэта...

Рэшта рэзалюцыяў была так сама выламліваньнем адчыненых варотаў.

Да гэтага ўсяго, цэлая канфэрэнцыя таўклася ў камплетнай нясьведамасьці месца й прастору, аб чым сьведчыць факт, што ўдзельнікі, развалкоўваючы праблемы Сярдняй і Ўсходняй Эўропы, ня вельмі арыентаваліся на карце гэных земляў. Беларусь і Украіна, якія бліжэй Сярэдняй чым Ўсходняй Эўропы, навет у Ўсходняй ня браліся пад увагу, ды бадай ні словам не ўпамянуліся, як-бы яны былі на месяцы або прынамсі — у Афрыцы.

Прычына ясная: Заходнія палітыкі сваей шчодрасьцю для Масквы, ахвяроўваючы ей Беларусь і Украіну, хочуць гэтым купіць ласку Сталіна, а іншыя, як напр. палякі, старымі мэтадамі старанна гэта абміналі. А адныя й другія, згодна із страўсавай палітыкай, хавалі галаву ў пясок: а можа штосьць здарыцца, таксама як Сталін навернецца на альтруізм, дабраахвотна аддасьць сваю здабычу, а сам у зрэбнай кашулі пойдзе пакутаваць у Салавецкі манантыр...

Дык трудна спадзявацца пазытыўных рэзультатаў, а навет браць паважна імпрэзу, дзе творацца так шырокія праекты, але тыя, што іх твораць, адны камплетныя ігнаранты, а другія пазбаўленыя пачуцьця рэалізму. Бо каму як каму, але палякам справа Беларусі і Украіны павінна быць праблемай.

Вяртаючыся да ролі справаздаўчай, трэба зацеміць, што найбольшую колькасьць дэлегатаў і прамоўцаў складалі палякі, бо аж 23, ня лічучы абсэрватараў і клякераў (тэрмін польскі — гэта кібіцы, якіх заданьнем ёсьць рабіць «бурныя воплескі»). Трэба ім прызнаць, што, хаця дома вешаюць сабак адзін на другім — на вонкі выступаюць салідарна Мікалайчык, Белецкі, Цёлкаш ці Вяжбяньскі. Салідарна абміналі беларускія й украінскія праблемы, салідарна пеніліся, калі штось не адказвала польскай «рацыі стану». Так напрыклад, заядла пратэставалі супраць францускага праекту ў справе будучых граніцаў. Праект гэты гаварыў, што «як толькі народы Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы здабудуць незалежнасьць, першым абавязкам іх будзе ўзгодніць розьніцы, якія ў будучыні могуць перашкаджаць у іх супрацоўніцтве. Прадстаўнікі гэтых краінаў забавязваюцца жадаць, каб розьніцы, якія заіснуюць паміж імі, былі падданыя пад арбітраж нэўтральных дзяржаваў». А ведама, што арбітраж у справе граніц палякам непажаданы. І дзеля таго так заядла шумелі, што напасьледак пленум, дзеля сьвятога спакою, змадыфікаваў праект, што вышла нешта пасрэднае паміж сабакам і самакатам.

Польская прэса трыумфальна затрубіла, што Мікалайчык на канфэрэнцыі пракляў Ялту. Але, ці, праклінаючы Ялту, благаславіў Рыгу?...

У выніку — усе былі задаволеныя з канфэрэнцыі, што адрозьнівае яе ад Вісбадэнскай, якая была ўнікатам, бо ўсе, што бралі й ня бралі ў ей удзелу, былі моцна незадаволенымі. Тут-жа наадварот, бо навет беларусы й украінцы, якіх на канфэрэнцыю не запрасілі, ня маюць спэцыяльных прычынаў да роспачы.

Варта толькі яшчэ адцеміць, што сэкцыя беларускага фэдэральнага руху ў Ангельшчыне падпісалася пад супольным пратэстам, зложаным на канфэрэнцыі ўсімі зацікаўленымі народамі, а аналягічныя беларускія сэкцыі ў Бэльгіі й Нямеччыне, за пасярэдніцтвам прадстаўніка аднэй нэўтральнай дзяржавы, на рукі старшыні канфэрэнцыі зложылі мэмарыял, у якім быў выказаны пратэст супраць таго, што ангельскія арганізатары й удзельнікі канфэрэнцыі вызначылі Беларусі месца вонках Эўропы.

пс.

На землях Беларусі

КАМУНІСТЫЧНАЯ ІДЭАЛЕГІЯ НЯ ПРЫВІВАЕЦЦА

Усе дадзеныя гавораць за тым, што з камуністычным выхаваньнем і перавыхаваньнем ня толькі масаў, але й камуністычнага актыву на Беларусі маюць бальшавікі шмат клопатаў. Бальшавіцкая ідэалёгія, чужая й варожая беларускму народу, ніяк ня можа прывіцца сярод беларускіх масаў, ня гледзячы на вялізарныя намаганьні бальшавікоў. Аб гэтым вельмі вымоўна сьветчаць усе тыя мерапрыемствы, якія праводзіць камуністычная партыя з мэтаю паглыбленьня Ленінска-Сатлінскай ідэалёгіі й выкараненьня «нацыяналістычных ухілаў».

Як падае савецкая прэса, толькі на працягу ліпеня й жнівеня мінулага году камуністычныя агітатары прачыталі на Беларусі аж 25.00 дакладаў толькі на адну тэму, паймення — «Савецкі Саюз, як гарантыя міру й бясьпечнасьці народаў», якую праслухала таксама рэкордная колькасьць, бо аж 1.850.000 чалавек.

Маскоўская «Праўда» зьмясьціла за 26 сьнежаня 1951 г. вялікі артыкул аб ідэалягічнай дзейнасьці камуністычнай партыі Беларусі. Там між іншым знаходзім наступныя інфармацыі:

«У бягучым годзе камітэты партыі зьвярнулі асаблівую ўвагу на пытаньні павышэньня ідэйна-тэарэтычнай узроўні ў дзейнасьці ўсіх сяброў партыйнага выхаваньня...»

«Вялікую работу ў галіне выхаваньня народных масаў у духу вялікіх ідэяў Леніна-Сталіна праводзіць армія агітатараў, якія складаюцца з камуністых і беспартыйных і налічваюць у рэспубліцы звыш 180.000 чалавек».

«У дзейнасьці Акадэміі Навук, вышэйшых навуковых установаў і навукова-дасьледавальных інстытутаў заўважваецца яшчэ многа недахопаў. Партыйныя арганізацыі вышэйшых школаў і навуковых установаў яшчэ не дабіліся таго, каб пытаньні палітычнага выхаваньня, пляны навуковае работы й іншыя пытаньні былі сыстэматычна абмяркоўваныя на паседжаньнях партыйнага бюро і на сабраньнях камуністых»...

Аднак партыйныя арганізацыі робяць усё магчымае, каб хоць як-небудзь вывязацца із вайго заданьня. Аб гэтым чытаем далей:

«У выкананьне гістарычных пастановаў ЦК камуністычнай партыі Савецкага Саюзу й указаньняў таварыша Сталіна узмацняюць партыйныя арганізацыі Беларусі сваю работу ў галіне камуністычнага выхаваньня працоўных, яны вядуць змаганьне супраць пережыткаў капіталізму ў сьведамасьці людзей, супраць іхнага павароту да буржуазнага нацыяналізму й касмапалітызму».

Гэтак ужо звыш трыццацёх год выкараняюць расейскія камуністыя перажыткі «буржуазнага нацыяналізму» й «капіталізму» ў сьведамасьці беларускага народу, але гэтыя «пережыткі», аказываецца, на столькі сільныя, што нiякімі спосабамі іх выкараніць ня ў сілах.

У вабліччы новай палітычнай сытуацыі

(Заканчэньне)

ніка латыскага эгзыльнага ўраду Ю. Зэльмансa, што ЗША і надалей ня маюць намеру вызнаць анэксыі гэтых дзяржаваў Савецкім Саюзам, уважаючы гэты паступак Саветаў за нелегальны. Палітычныя колы балтійскіх народаў, будучы ўпэўненымі, што й яны пасьля зьнішчэньня бальшавізму стануцца аўтаматычна незалежнымі, ня выказваюць асаблівай ахвоты ўваходзіць у палітычнае супрацоўніцтва з народамі, што такіх гарантыяў з боку Захаду ня маюць, уважаючы такое супрацоўніцтва за лішні для сябе баласт. Ня ўходзячы ў пытаньне, ці такая палітыка прыбалтаў зьяўляецца карыснай навет для іх самых, факт астаецца фактам, што не зьяўляюцца яны вельмі надзейнымі саюзьнікамі, як і ня былі імі ніколі раней, для народаў, што жывуць ад іх далей на ўсход і паўдзёны-усход.

Тое, што АБН-у удалося задзіночыць палітычныя арганізацыі аж 24 народаў, бясспрэчна зьяўляецца не абы-якім сукцэсам для гэтае арганізацыі. Але адначасна зьяўляецца гэта й прычынаю ейнае слабасьці: добрая палавіна сяброў АБН уважае, што расейскі імпэрыялізм пасьля зьнішчэньня бальшавізму ня будзе загражаць у вялікай меры іхнай сувэрэннасьці, пакладаючы ўсе надзеі на сваё сяньняшняе праўнае становішча, калі для народаў, якіх акупаваў Савецкі Саюз пасьля першай сусьветнай вайны, зьяўляецца справа гэтая пытаньнем жыцьця й сьмерці. Далёка ня ўсе палітыкі сяньняшніх савецкіх сатэлітаў, а яшчэ менш спасярод балтыйскіх народаў хочаць здаваць сабе справу з таго, што будучая небальшавіцкая Расея, не адсунутая да сваіх этнаграфічных межаў, але яшчэ ўзмоцненая коштам далейшага паняволеньня Беларусі, Украіны, Казакіі, Каўказу й Туркестану, будзе ўвесь час прадстаўляць для іх самых сьмяротную небясьпеку.

АДМЕННАЕ ПАЛАЖЭНЬНЕ НАРОДАЎ НА УСХОД АД ЛІНІІ БУГУ Й САНУ

У найгоршым, на жаль, палажэньні знаходзяцца сяньня народы на ўсход ад лініі Бугу й Сану: дэмакратычны Захад яшчэ ня высказаўся за іхную дзяржаўную незалежнасьць у будучыні й аддзяленьні ад Расеі. Толькі некаторыя падзіночныя палітыкі Ангельшчыны й ЗША дамагаюцца зьмены палітычнага курсу ў дачыненьні да нацыянальнай праблемы падсавецкага Ўсходу, і рады гэтых запраўдных піянэраў разьдзелу расейскай турмы народаў усьцяж павялічваюцца. Аднак бальшыня вядучых палітыкаў Захаду, а таксама й дзяржайныя дзейнікі яшчэ ня думаюць сходзіць з традыцыйнай пазыцыі захаваньня непадзельнай Расеі.

Расейскія эміграцыйныя палітыкі із свайго боку, каб прадэманстраваць свой «дэмакратызм» і «антыімпэрыялізм», ня робяць ніякіх пасяганьняў на сувэрэнітэт сатэлітных дзяржаваў, афіцыяльна ня вызнаюць Сталінскіх захопніцтваў пасьля 1939 г. (вызнаючы, аднак, ранейшыя захопніцтвы Леніна), хаця — ідучы шляхам традыцыйнага звычаю царскай Расеі, — ня скрываюць сваіх апэтытаў на прыбалтыйскія народы: Затое што тычыцца народаў, анэктаваных Савецкім Саюзам перад 1939 г., то ўсе расейскія палітычныя кірункі на эміграцыі згодныя ў тым, што Расея ня можа й не павінна згадзіцца на іхнае аддзяленьне, пагражаючы навет сілай здушыць сэпаратыстычныя рухі «самостийников».

Такім чынам паняволеныя перад другой сусьветнай вайной народы мусяць яшчэ змагацца за вызнаньне Захадам сваіх правоў на дзяржаўную незалежнасьць, тады, калі астальныя народы маюць гэтыя правы загарантаваныя. Апрача таго яны мусяць траціць сваю энэргію й сілы на абарону перад расейскімі імпэрыялістычнымі пасяганьнямі, тады, калі тыя-ж расейцы ад пасяганьню на сувэрэннасьць астальных народаў, у тым ліку й прыбалтаў, адмовіліся. Вось у гэтым і заключаецца адменнасьць палажэньня нашых народаў ад народаў сатэлітных дзяржаваў, а таксама й прыбалтаў.

ЗА НОВЫ МІЖНАЦЫЯНАЛЬНЫ БЛЁК ПАНЯВОЛЕНЫХ НАРОДАЎ

Мы ўважаем, што далейшая дзейнасьць АБН павінна разьвівацца зь няслабнуючым размахам. Мы здаём сабе справу з таго, што значэньне гэтай арганізацыі дзеля заманіфэставаньня салідарнасьці ўсіх паняволеных народаў у змаганьні з расейска-бальшавіцкім імпэрыялізмам вялізарнае. Але само жыцьцё паказала, што гэтая салідарнасьць і далейшае зацясьненьне міжнацыянальнага супрацоўніцтва часта часта разьбіваецца й ягоныя мэты разыходзяцца ў сувязі з тым, што адныя народы — сябры СБН маюць ужо загарантаванае на будучыню тое, за што астальныя народы павінны яшчэ весьці найбольш інтэнсыўнае змаганьне. І таму, на наш пагляд, ужо насьпела патрэба стварэньня й арганізацыйнага афармленьня, незалежна ад АБН, новага міжнацыянальнага блёку такіх народаў, як беларусы, украінцы, казакі, туркестанцы, народы Каўказу й Ідэль-Уралу, над якімі завісла найбольшая загроза расейскага паняволеньня навет пасьля зьнішчэньня бальшавізму.

Праектаваны намі блёк, дзеля сваей аўтарытэтнасьці й палітычнае сілы, не павінен стацца ўдзелам аднаго толькі палітычнага кірунку сярод паасобных народаў, пакідаючы іншыя палітычныя фармацыі паза рамамі гэтага блёку. У ім мусілі-б задзіночыцца ўсе бяз выключэньня палітычныя плыні ўспомненых нерасейскіх нацыянальнасьцяў, што стаяць на прынцыпах зьнішчэньня расейскага імпэрыялізму ўсякіх колераў і бескампрамісавага змаганьня за свае сувэрэнныя правы.

Мэтай гэтага міжнацыянальнага блёку ці арганізацыі падсавецкіх народаў было-б супольнымі задзіночанымі й скаардынаванымі сіламі адбіваць усе імпэрыялістычныя пасяганьні расейцаў на іхныя сувэрэнныя правы з аднаго боку, як і заактывізаваць да найвялікшых разьмераў супольную прапагандовую й дыпляматычную акцыю перад заходнім сьветам, каб у ягоных плянах будучага ўпарадкаваньня падсавецкага Ўсходу канечнасьць разьдзелу расейскае імпэрыі на нацыянальныя дзяржавы паняволеных народаў ня выклікала ніякіх засьцярогаў.

Адныме з аргумэнтаў расейскіх імпэрыялістых за захаваньне адзінай і непадзельнай Расеі ёсьць назойлівае цьверджаньне, што балканізацыя Ўсходу Эўропы й падсавецкай Азыі, якая была-б вынікам пазьдзелу расейскай імпэрыі, прывяла-б да непажаданых міжнародных камплікацыяў, а навет магла-б выклікаць міжсобныя войны. Вось-жа мы й павінны даказаць нашым згодным супрацоўніцтвам і бясспрэчным пашанаваньнем прыродных інтарэсаў кажнага народу, што такая балканізацыя ня толькі нічога небясьпечнага ў сабе не хавае, але зьяўляецца найважнейшай перадумовай згоднага сужыцьця й шчырага супрацоўніцтва вольных народаў.

Таму ўсе сябры прапанаванага намі блёку павінны выказаць максымум палітычнага розуму й такту. Незалежна ад колькаснае сілы й удзельнае вагі паасобных партнэраў — сяброў блёку, іхная раўнапраўнасьць павінна быць строга захаванай ня толькі фармальна, але й фактычна. Не павінна тады некаторымі нацыянальнасьцямі акцэнтавацца, дзе трэба й ня трэба, вядучай іх кіраўнічай іхнай ролі, як гэта, на жаль, робіцца ў іншых міжнацыянальных арганізацыях, чым нядвузначна выяўляюцца імкненьні де будучай гэгэмоніі гэных народаў. Таксама й яшчэ тым больм не павінна мець месца выкарыстоўваньне такога блёку больш актыўнымі сяньня нацыянальнасьцямі выключна для собскіх мэтаў коштам іншых ягоных партнэраў, што таксама знаходзіць свае прыклады ў дасюлешніх міжнацыянальных дачыненьнях.

Справа будучых дзяржаўных межаў гэтых народаў павінна базавацца на прынцыпе этнаграфічным з дапушчэньнем плебісцыту на сумежных тэрыторыях мяшаных, які быў-бы праведзены пад наглядам міжнародных воргану.

Высунутыя тут намі мерапрыемствы маглі-б задзіночыць і сцэмэнтаваць не расейскія падсавецкія народы ў вадзін сільны й непераможны блёк, аб разьбіліся-б усялякія пасяганьні расейскіх імпэрыялістых, як і дасюлешняя ігнаранцыя Захаду.

Дык слова ў гэтай важнай справе астаецца цяпер за вядучымі палітыкамі нашых народаў.

Нью Ёрк, у студзені 1952 г.

Ст. Крушыніч

Пастанова ЗН у справе уцякачоў

Трэйцяя камісыя ЗН прыняла 10 студзеня сёлета 39 галасамі супраць 5 (савецкі блёк) пры 6 паўстрымаўшыхся праект рэзалюцыі, які супольна прадставілі прадстаўнікі Калюмбіі, Даніі, Лібану, Галяндыі, Новай Зэляндыі, Вялікабрытаніі й Уругваю з дадаткамі Сырыі. Тэкст рэзалюцыі наступны:

«Генэральная Асамблея,

прыняўшы да ведама паведамленьне Міжнароднай Арганізацыі для Ўцекачоў (IPO), ды абсэрвацыі ў справе пытаньня дапамогі, пра якое гаворыцца ў справаздачы Высокага Камісара ЗН для Ўцекачоў, што ён яго прадставіў, згодна з рэзалюцыяй 430-(V), з 14 сьнежаня 1951 г.,

прыняўшы да ведама паважныя пытаньні, якія будуць існаваць у некаторых краёх у сувязі з уцекачамі, якія ня будуць рэпатрыяваныя ані перасеЛеныя пасьля спыненьня дзейнасьці IPO,

уважаючы, што трэба безадкладна знайсьці разьвязку праблемы ўцекачоў, уключна з рэпатрыяцыяй тых, якія гэтага жадаюць,

1. дазволіць Высокаму Камісару, згодна з параграфам 10-ым статуту Высокага Камісарыяту, кінуць заклік з мэтаю зьбіраць фонды для безадкладнай дапамогі найбольш патрабуючым групам уцекачоў, што яму падлагаюць;

2. рэкамэндуе ўсім дзяржавам, якія непасрэдна зацікаўленыя праблемаю ўцекачоў, а таксама кампэтэнтным спэцыялізаваным інстытуцыям і іншым міжнародным арганізацыям, зьвярнуць больш увагі на гэтую праблему падчас плянаваньняў адбудовы й эканамічнага разьвіцьця й прасіць Высокага Камісара палепшываць запачаткаваную ў гэтым кірунку дзейнасьць, бяручы пад увагу тое, што было-б пажаданым рэпатрыяваць да краінаў паходжаньня тых уцекачоў, якія гэтага зажадаюць;

3. прасіць дзяржавы, якія зацікаўленыя ў пытаньнях міграцыі, даць усе магчымыя палёгкі падлягаючым Высокаму Камісару ўцекачом, каб умажлівіць ім прыймаць удзел у праектах, якія мелі-б падтрымліваць міграцыю, і з гэтых праектаў карыстаць».

Вось і ўсё, на што здабыліся Задзіночаныя Нацыі, каб разьвязаць узапраўды пякучую патрэбу ўпарадкаваньня праблемы ўцекачоў: дазволілі Высокаму Камісару зьвярнуцца з заклікам зьбіраць фонды на дапамогу найбольш патрабаючым групам уцекачоў (відаць, ЗН уважаюць, што ёсьць і непатрабуючыя) ды заахвочваць іх да рэпатрыяцыі. Калі-ж бо гэтае зьненавіджанае слова «рэпатрыяцыя» будзе напасьледак выкінута із слоўніка розных міжнародных органаў Захаду? А тымчасам усе тыя ўцекачы, якім не дазволена выэміграваць, мусяць і надалей жыць сьціснутымі ў недапушчальных кватэрных умовах у лягерах Нямеччыны на 35 марак у месяц (адзінокія й галовы сем'яў), 25 марак (сябры сем'яў) і 20 марак (дзеці), ды за гэтыя жабрацкія грошы пракармлівацца й адзявацца.

ШУКАЮЦЬ

Аляксандра Савіцкага ў веку 52 гады, народжанага ў вёсцы Казіна Слонімскага павету, шукае знаёмы Тодар Барысік.

Весткі слаць на Адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Сяргіевіча Юльяна шукае **Сяргіевіч Васіль.** Просьба адгукнуцца на адрас: 9, rue de la Dreve, Harchies, Hainaut, Belgique.

Прадстаўніцтвы „Бацькаўшчыны“

ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ:

1. **У Бэльгіі:**
   Mr. Karas Leonid, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.
2. **У Ангельшчыне:**
   The Whiteruthenian Editorial Foundation 52, Penn Road, London, N. 7. England.
3. **У Францыі:**
   Mr. Symaniec Vladimir, 15, rue du Ltn. Boncour, Neuilly s/Seine, France.
4. **У ЗША:**
   Mr. B. Danilovich, 222 Suydam St. New Brunsvick, N. J., U. S. A.
5. **У Канадзе:**
   Mr. Joseph Corny, 270 Clinton Str. Toronto, Ont., Canada.
6. **У Аргентыне:**
   Asociacion Bielorusa en la Argentina calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio prov. Buenos Aires. Argentina.
7. **У Аўстраліі:**
   Mr. Jackievic Donat, 60 Fisher Street, East Brisbane, Q-ld, Australia.
8. **У Вэнэцуэлі:**
   Dudzickj Vladimir, Crucesita a San Miquel 74, Caracas, Venezuela.
9. **У Новай Зэляндыі:**
   Mr. Karanieuskj Marjan, Burns Izonsc, Mosgiel, New Zeeland.

Непастрэдна з гэтых прадстаўніцтваў просім суродзічаў выпісваць «Бацькаўшчыну» і там-жа разьлічвацца за газэту.

З прычыны дэвізовых абмежаваньняў у Нямеччыне грошы за «Бацькаўшчыну» з усіх краінаў паза Нямеччынай просім перасылаць на наступны адрас:

Mr. Jan Zaprudnik, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.